5. Шамякіна Т. Пасляслоўе да рамана “Вазьму твой боль” // [Электронны рэсурс]. 2018. Рэжым доступу: https://edudocs.net/2263987/

# ГЕРОЙ-АХВЯРА Ў ТВОРЧАСЦІ І. ШАМЯКІНА 1990-Х ГАДОЎ (НА ПРЫКЛАДЗЕ АПОВЕСЦЕЙ «БЕЗ ПАКАЯННЯ» І «ЗАВІХРЭННЕ»)

**К. В. Уніятава**

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны,*
*вул. Савецкая, 104, 246019, Гомель, Беларусь,*
*uniatowaekaterina@gmail.com,*
*Навуковы кіраўнік: Брадзіхіна А. В.,*
*дацэнт, кандыдат філалагічных навук*

У артыкуле на пракладзе аповесцяў «Без пакаяння» і «Завіхрэнне» народнага пісьменніка БССР Івана Шамякіна разглядаюцца вобразы герояў-ахвяраў. У першай пісьменнік выносіць прысуд тагачаснаму грамадска-палітычнаму ладу, адмаўляючы яму ў будучыні. Пісьменнік падкрэслівае, што грамадства 90-х гадоў ХХ стагоддзя, у якім назіраецца відавочнае падзенне маралі, аддалілася ад разумення каштоўнасці чалавечага жыцця. У другой аповесці героі становяцца ахвярамі абставін, «злачынцамі паняволі», але пісьменнік праз глыбокае раскрыццё філасофскіх праблем (пакарання, даравання, кахання, граху, волі, помсты, выбару) даводзіць выключную важнасць захавання чалавечага ў чалавеку, а таксама паказвае як стваральную, так і разбуральную моц стэрэатыпаў грамадства ў іх уздзеянні на асобу.

***Ключавыя словы***: Іван Шамякін; творчасць; аповесць «Без пакаяння»; аповесць «Завіхрэнне»; літаратурны герой.

Праблема літаратурнага героя – адна з важнейшых у філалагічнай навуцы. Пад тэрмінам «літаратурны герой» разумеецца цэласны вобраз чалавека – у сукупнасці яго аблічча, ладу думак, паводзін і душэўнага свету. Не важна, выдуманы ён ці мае рэальнага прататыпа, мастацкае слова ўвасабляе яго як абагульнены вобраз. Побач з тэрмінам «літаратурны герой» ужываюцца сінанімічныя паняцці «персанаж», «дзейная асоба», «літаратурны характар». Аднак кожнае з іх мае ўласнае семантычнае напаўненне: літаратурнымі героямі называюць дзеючых асоб (персанажаў), намаляваных больш шматгранна для рэалізацыі ідэі твора. Часам «літаратурным героем» называюць дзеючых асоб, блізкіх да аўтарскага ідэалу чалавека (так званы станоўчы герой) ці асоб, якія ўвасабляюць гераічны пачатак (напрыклад, героі былін, эпасу, трагедыі). Варта адзначыць, што ў літаратуразнаўстве гэтыя тэрміны, разам з паняццямі «характар», «тып» і «вобраз», разумеюцца як узаемадапаўняльныя.

У аповесцях 1990-х гадоў І. Шамякіну ўдалося стварыць даволі цікавую галерэю герояў-сучаснікаў, што, на думку А. Макарэвіча, «сведчаць пра сацыяльныя “зрэзы” з рэчаіснасці першай паловы 1990-х гадоў: абсалютная беднасць і багацце, імкненне да пакаяння і непрыманне яго» [1, с. 500]. Пісьменнік звярнуўся да самых розных сацыяльных слаёў, па-мастацку ўвасобіў вобразы інтэлігентаў, навукоўцаў, рабочых, чыноўнікаў «новага» і «старога» часу («Сатанінскі тур», «Без пакаяння», «Палеская мадонна», «Адна на падмостках», «Бумеранг», «Выкармак» і інш.). І. Шамякін паказаў у сваіх аповесцях і «герояў» новага часу – бізнесменаў, прадпрымальнікаў, ацэнку якім даваў досыць адмоўную.

Кожная новая аповесць пісьменніка, нягледзячы на, здавалася б, паўтаральнасць праблематыкі, падабенства герояў і шляхоў вырашэння жыццёвых сітуацый, успрымаецца па-новаму. І. Шамякін – майстар сюжэта. Кожны канфлікт вырашаецца ў яго творах па меры станаўлення герояў (гэта і ўплыў грамадскіх падзей, і кола людзей, якое атачае пэўнага персанажа, нават псіхалагічны стан пісьменніка на момант напісання тэксту аказвае

моцны ўплыў). У І. Шамякіна няма банальных сюжэтаў, ім уласціва непрадказальнасць, да апошняга моманту чытач спадзяецца на шчаслівую развязку падзей, але ў аўтара часцей за ўсё атрымліваецца зрабіць так, каб фінал кожнай аповесці быў выключным, нават неверагодным.

90-я гады XX стагоддзя на ўсёй постсавецкай прасторы былі досыць складаным часам класавага расслаення, эпохай, калі выжываў мацнейшы, хітрэйшы, нахабнейшы. Разгледзім вобразы герояў-ахвяр тагачаснага грамадска-палітычнага ладу, якіх пераканаўча і псіхалагічна дакладна стварыў І. Шамякін у творах «Без пакаяння» і «Завіхрэнне».

У аповесці «Без пакаяння» эпоха маральнага заняпаду грамадства паказана ў рэальным сваім абліччы са шматлікімі складанасцямі, што перажываюць героі, з іх духоўным станаўленнем і падзеннем. У пачатку твора акрэсліваюцца жудасныя ўмовы выжывання (менавіта выжывання!) сям'і чатырнаццацігадовага Васілька Кірпача: «Трэці месяц хварэе маці, не ходзіць на працу. А тут яшчэ і сястрычка Анька ангіну схапіла. А бацька зноў запіў. Украў пазаўчора і тыя грошы, што прынесла маці з фабрыкі – дапамогу, і тыя, што зарабіў ён [Васілёк – У. К.] мыццём машын, калі ішлі дажджы. За што купіць хлеб і малако?» [2, с. 111]. Ужо толькі з гэтага невялікага ўрыўка можна зрабіць выснову, як бедна жыла сям'я Васілька і якім чынам даставаліся грошы на хлеб.

Але матэрыяльная нястача тут толькі задае вектар матыву ахвяравання, які прывядзе героя да згубы. Факт гранічнай беднасці потым пацвярджаецца ў эпізодзе наведвання сям'і забітага хлопчыка следчым Кудрам, які заўважае сціпла абсталяваны пакой («маленькі пісьмовы стол накшталт школьнай парты» [2, с. 144]). Як бы гэта ні выглядала страшна, І. Шамякін пазбавіў жыцця свайго маленькага героя – Васілька, які «паводле аўтарскай характарыстыкі, з'яўляецца прыстойным прадстаўніком таго пакалення, якому ствараць будучыню» [1, с. 500], – зазначае А. Макарэвіч. Па сутнасці, праз матыў смерці дзіцяці пісьменнік акрэслівае няпэўнасць новага дня, бесперспектыўнасць такога будучага.

У 1997 годзе І. Шамякін напісаў аповесць «Завіхрэнне». На першы погляд здаецца, што нічога новага мастак слова тут не сказаў, бо ў большасці яго твораў адлюстраваны падзеі, актуальныя для часу іх напісання. Але варта звярнуць увагу на тое, з якімі думкамі жывуць героі Алег Журковіч і Іван Ціхотка: жаданне пайсці па шляху дабрачыннасці, дапамагчы бедным. Ці не гэта ўжо першыя штрыхі для магчымага духоўнага ператварэння, эвалюцыі постсавецкага грамадства? На першы план у герояў аповесці выходзіць мараль, гуманізм і чалавечнасць, клопат не за сябе, а за бліжняга. Яны апантаны ідэяй адмысловага «робінгудства».

На першых старонках аўтар знаёміць чытача з персанажамі, якія з'яўляюцца ахвярамі абставін. У Журковіча і Ціхоткі пачынаецца перыяд новага, як ім хочацца думаць, светлага жыцця, калі ўсё можна пачаць «з чыстага аркуша». А за плячыма – доўгі час у няволі, за кратамі, адбыццё тэрміна пакарання ў зоне абмежавання свабоды. Алег Журковіч быў бязвінна асуджаны. Яго жыццё ўмоўна можна падзяліць на дзве паловы. Да таго, як трапіў у турму, гэта быў малады архітэктар, закаханы ў Рагнеду. Але ў хуткім часе ў жыцці Журковіча з'явілася чорная паласа: яго абвінавацілі ў забойстве. Адсутнасць алібі, выпадкова пакінутая ўжо колькі часу таму акрываўленая насоўка з Рагнедзінай крывёю ды дзённікавы запіс дзяўчыны: «Зноў пасварыліся з Алегам. Ён сказаў, што яму хочацца забіць мяне. Ой, як страшна! А я засыпаю ў яго пасцелі» [3, с. 223] – усяго гэтага хапіла для таго, каб завесці крымінальную справу і вынесці смяротны прысуд Журковічу. Наступны перыяд жыцця героя пачаўся з сямі гадоў пакутаў у турме. Два месяцы ён чакаў памілавання і за гэты час нават пасівеў. Але адвакат сказала, што Журковіч можа дзякаваць лёсу за тое, што яшчэ лёгка ўсё абышлося.

Пісьменнік ставіць героя перад выбарам: знайсці ў сабе сілы і адмовіцца ад помсты ці, як і абяцаў Рагнедзе, здзейсніць пакаранне. Аднак, нягледзячы на тыя пакуты, якія перанёс Журковіч, высокая чалавечнасць героя перамагае яго жаданне адпомсціць. Чытач назірае свайго роду нараджэнне новага чалавека з новымі каштоўнасцямі,

ідэаламі і перакананнямі. Філасофскія праблемы набываюць у творы цікавае вырашэнне. Тут пакаранне мяжуе з дараваннем. Каханне супрацьстаіць забойству, свабоднае жыццё – існаванню за кратамі. Аўтар глыбока асэнсоўвае паняцце жыццёвых нормаў, правіл, якіх прытрымліваецца грамадства, іх стваральнага і разбуральнага ўздзеяння на асобу.

Адметна, што ні Журковіч, ні Ціхотка не ператварыліся ў злодзеяў і выродкаў. Яны вынеслі толькі лексіку турэмнага жыцця, мянушкі, але ніяк не яго мараль і філасофію. Дарэчы, варта падкрэсліць, што Журковіч быў атэістам, не ведаў ніякіх малітваў, але маліўся начамі, прасіў Бога, і, як бачым, Бог заняў усё месца ў душы героя. Героі аповесці «Завіхрэнне» разбіраюцца, а дакладней кажучы, спрабуюць разабрацца, у складаных сітуацыях, што падкідвае ім жыццё, у сутнасці праблем, што стаяць перад грамадствам. Але ж асабістыя «шкілеты» перашкаджаюць іх душам цалкам «аднавіцца». Іван працягвае «хварэць на клептаманію», падвёўшы пад сваё жаданне ідэалагічны грунт: «Я краду толькі ў багатых» [3, с. 215]. Алег не можа дараваць, вымушае крыўдзіцеля расплаціцца за памылку – забірае ў Загадая не толькі дачу, але і дае Івану дазвол скрасці немалыя грошы ў пракурора – сорак тысяч даляраў. Цікава, што твор заканчваецца шчасліва, хаця агульная драматычная атмасфера не наводзіць думкі на такі фінал.

Такім чынам, у аповесцях «Без пакаяння» і «Завіхрэнне» створаны выразныя тыпы герояў-ахвяр. У першай мы бачым карціну гранічнага збяднення народа праз лёс сям'і чатырнаццацігадовага Васілька Кірпача, што ўрэшце вырашаецца трагічна, праз смерць хлопчыка. Тым самым пісьменнік выносіць прысуд тагачаснаму грамадска-палітычнаму ладу, адмаўляючы яму ў будучыні. Пісьменнік падкрэслівае, што грамадства 90-х гадоў ХХ стагоддзя, у якім назіраецца відавочнае падзенне маралі, аддалілася ад разумення каштоўнасці чалавечага жыцця. У другой аповесці героі становяцца ахвярамі абставін, «злачынцамі паняволі», але пісьменнік праз глыбокае раскрыццё філасофскіх праблем (пакарання, даравання, кахання, граху, волі, помсты, выбару) даводзіць

выключную важнасць захавання чалавечага ў чалавеку, а таксама паказвае як стваральную, так і разбуральную моц стэрэатыпаў грамадства ў іх уздзеянні на асобу.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Макарэвіч А. Чалавецтва ў сваім развіцці пайшло не па той дарозе... // Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. Мінск: Маст. літ., 2011. Т. 6 : Аповесці, 1994–1996. С. 498–526.
2. Шамякін І. П. Збор твораў: у 23 т. Мінск: Маст. літ., 2011. Т. 6 : Аповесці, 1994–1996.
3. Шамякін І. П. Збор твораў: у 23 т. Мінск: Маст. літ., 2011. Т. 7 : Аповесці, 1996–1998.


# КАХАННЕ І ВЕРНАСЦЬ ПРАЗ ПРЫЗМУ ЧАСУ (НА МАТЭРЫЯЛЕ АПОВЕСЦІ ІВАНА ШАМЯКІНА «НЕПАЎТОРНАЯ ВЯСНА»)


**К. А. Урбановіч**

*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,*
*вул. Ажэшкі, 22, 230023, Гродна, Беларусь,*
*ksenyaurbanovich@gmail.com,*
*Навуковы кіраўнік: Садоўская А. С.,*
*загадчык кафедры беларускай філалогіі, дацэнт, кандыдат філалагічных навук*



Артыкул прысвечаны разгляду тэмы кахання ў аповесці «Непаўторная вясна» класіка беларускай літаратуры Івана Шамякіна. Сцвярджаецца, што непаўторная вясна павінна быць у жыцці кожнага чалавека. Гэта час, калі ўсе па-сапраўднаму шчаслівыя, як героі Івана Шамякіна ў сваю непаўторную вясну. Вясна, якая бывае ў каханні